Учреждение
«Зональный государственный архив в г. Кричеве»

Виртуальная выставка
приуроченная к Году качества

# «Лучшие труженики села Кричевщины на страницах газет»

Подготовила:
ведущий архивист
Кондратенко Виктория Валерьевна

После Великой Отечественной войны передовиками сельского хозяйства в СССР стали колхозники и работники колхозов, которые самоотверженно трудились для восстановления и развития отрасли. В БССР, как и по всему Союзу, наблюдалось массовое движение за повышение производительности труда и восстановление разрушенного хозяйства.

Среди передовиков можно выделить имена колхозников, звеньевых, бригадиров, которые своим трудом и новаторскими подходами внесли значительный вклад в восстановление и развитие сельского хозяйства, достигнув высоких производственных показателей.

Их имена часто упоминались в прессе, им присваивались звания Героев Социалистического Труда, они награждались орденами и медалями.




***

# ПЕРАДАВІКІ СЕНАНАРЫХТОВАК

**Па прадстаўленню райвыканкома, райкома КП(б)Б і аддзела сельскай гаспадаркі на раённую дошку гонару заносяцца:**

1. Калгас „**Комінтэрн**" Паланіцкага сельсовета (старшыня калгаса тав. **Кавалёў,** сакратар партарганізацыі тав. **Лапін**).

Калгас у сціслыя тэрміны правёў сенакашэнне і сіласаванне кармоў. Датэрмінова, на 105,5 працэнта выканаў план сенанарыхтовак.

2. Калгас імя **Карла Маркса** Кашанскага сельсовета (старшыня калгаса тав. **Ратабыльскі,** сакратар партарганізацыі тав. **Дубасаў**).

Калгас паспяхова заканчвае сенаўборачныя работы. Датэрмінова выканаў план сенанарыхтовак на 102,3 працэнта.

3. Калгас „**Сталінскі заклік**" Сакольніцкага сельсовета (старшыня калгаса тав **Пяскоўскі,** сакратар партарганізацыі тав. **Качанаў**).

Калгас датэрмінова, на 102 працэнта выканаў план сенанарыхтовак. Паспяхова праводзіць сенаўборачныя работы.

4. Калгас „**Ленінскі прызыў**" Паланіцкага сельсовета (старшыня калгаса тав. **Сідарэнка,** сакратар партыйнай арганізацыі тав. **Матвеенка**).

Калгас датэрмінова выканаў дзяржаўны план сенанарыхтовак на 101,5 працэнта і паспяхова праводзіць сенакашэнне.

Ф.27.Оп.2 Д.1.Л.25 .(1951г.)

# У перадавым калгасе

Калгас „Заветы Ільіча" з'яўляецца перадавым у Сакольніцкім сельсовеце, а таксама і ў раёне. Т у т усе сельскагаспадарчыя кампаніі праходзяць паспяхова.

Уступаючы ва ўборачную кампанію, калгаснікі абавязаліся жніво правесці за 8—10 рабочых дзён, адначасова распачаць малацьбу і датэрмінова выканаць сваю першую запаведзь, — хлебанарыхтоўкі. Свае с л о в а хлебаробы стрымалі з чэсцю. Калгас першым у раёне датэрмінова выканаў збожжанарыхтоўкі на 107 працэнтаў.

Выключная ўвага была звернута на пасеў азімых культур. На працягу лета папары ўтрымліваліся ў чыстым стане, праводзілася апрацоўка. Уся плошча засеяная азімінай добра ўгноена. План сяўбы калгас поўнасцю выканаў у лепшыя агратэхнічныя тэрміны.

Своечасовага і высокаякаснага правядзення сельскагаспадарчых работ калгас дабіўся дзякуючы добра наладжанай працоўнай дысцыпліне. Калгаснікі выконваюць і перавыконваюць дзённыя нормы выпрацоўкі. Дзімітрый Сыманкоў працуе ў калгасе конюхам. Разам з тым ён актыўна ўдзельнічае ў палявых работах. У час сенаўборкі ён штодзённа скашваў па 0,55 —0,60 лугу. Працаваў ён і на ўборцы хлеба. Добра працуюць такія калгаснікі, як Андрэй Несцярэнка, Еўдакія Абуховіч, Анатолій Якубенка, Сівасціцкі і другія.

У калгасе ўжо аббіт і расцелен л ё н. Нядаўна першая партыя ільну паднята са сцелішча. На нарыхтоўчы пункт здана каля 10 тон добраякаснай ільнапрадукцыі ў лік паставак.

Зараз калгаснікі ўбіраюць бульбу, узнімаюць зябліва.

**В. Бусуматараў,**
старшыня Сакольніцкага сельсовета.

# Масавая уборка бульбы

Члены сельскагаспадарчай арцелі імя Будзённага Баеўскага сельсовета распачалі масавую ўборку бульбы. У кожнай брыгадзе вылучаны спецыяльныя калгаснікі, якія разворваюць бульбу. Следам за выбаркай клубняў калгас будзе баранаваць, а затым пераворваць бульбянішча. Гэта дасць дадаткова сотні пудоў бульбы.

Для паспяховай здачы бульбы дзяржаве ў сельгасарцелі створана транспартная брыгада, а таксама будзе выкарыстана калгасная аўтамашына. За апошнія дні тут убрана бульбы з плошчы 16 гектараў. Больш 10 тон добраякаснай бульбы здана ў лік нарыхтовак.

* * *

Распачалі уборку бульбы калгасы Міхееўскага сельсовета, імя Карла Маркса Кашанскага сельсовета і рад другіх калгасаў.

Ф.27.Оп.2 Д.1.Л.46 .(1951г.)

# Перадавікі калгаснай вытворчасці

Вылучэнне кандыдатам у народныя суддзі тав. Руцкага Пятра Васілевіча калектывам рабочых і ІТР цэмзавода горача падтрымалі на сваім сходзе члены сельгасарцелі „Ударнік" гарадскога Совета і вылучылі сваіх прадстаўнікоў у выбіраемы народны суд.

Партыйная арганізацыя калгаса „Ударнік" гарадскога Совета адзінадушна вылучыла кандыдатам у народныя засядацелі па 1-му выбарчаму ўчастку Крычаўскай выбарчай акругі старшыню калгаса тав. Васкабойнікава Васілія Фёдаравіча.

Калгаснікі гэтага калгаса на сваім агульным сходзе адзінадушна вылучылі кандыдатамі ў народныя засядацелі лепшых калгаснікаў перадавікоў калгаснай вытворчасці. Брыгадзір чацвёртай паляводчай брыгады Захар Абіралаў унёс прапанову вылучыць кандыдатам ў народныя засядацелі перадавую калгасніцу Грабніцкую Ксенню Максімаўну. Яго прапанову горача падтрымаў член сельгасарцелі Сарочанка.

Старшыня калгаса Васкабойнікаў прапанаваў вылучыць кандыдатам у народныя засядацелі Пабажак Марыю Ягораўну якая працуе памошнікам рахункавода калгаса і старанна адносіцца да сваёй працы. Прапанову т. Васкабойнікава горача падтрымаў рахункавод калгаса Грыгор Сцебіхаў. Член праўлення—Пётр Чубанаў прапанаваў вылучыць кандыдатам у народныя засядацелі лепшую калгасніцу калгаса Наталлю Вырва якая і была горача падтрымана другімі калгаснікамі.

Ф.27.Оп.2 Д.1.Л.64 .(1951г.)

партызаны, дзе са зброяй

# Гаспадары зямлі

Пасля вызвалення Крычаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў паўсямесна пачалося аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Калгаснікі калгаса імя Будзённага Баеўскага сельсовета дружна ўзяліся за аднаўленне грамадскай гаспадаркі. Калгасам у гэты час стаў кіраваць старэйшы актывіст Сідар Францкевіч. За аднаўленне калгаснай жывёлагадоўлі ўзялася Аляксандра Валюжэніч.

— Часам суткамі прыходзілася працаваць на будаўніцтве жывёлагадоўчых памяшканняў, — успамінае Аляксандра Валюжэніч. Не даставала цясляроў. Як не было цяжка, але пабудавалі.

У 1946 годзе старшынёй праўлення выбіраецца Нікалай Сцяпанавіч Сапега. Вялікае жыццё пражыў Нікалай Сцяпанавіч. З першых дзён калгаснага будаўніцтва ў Беларусіі ён актыўна змагаўся за сацыялістычнае пераўтварэнне сяла. У гады вайны — працуе рабочым на Урале, старшынёй калгаса ў Сібіры. Але ўвесь час яго цягнула ў родныя беларускія краі. І ён прыехаў у Крычаў.

Савецкі ўрад, партыя і асабіста таварыш Сталін аказалі калгаснікам раёнаў ахопленых засухай вялікую дапамогу. Калгаснае сялянства не шкадавала сваіх сіл для аднаўлення і развіцця сельскай гаспадаркі. У тым ліку аднаўлялі сваю гаспадарку і члены сельскагаспадарчай арцелі імя Будзённага.

У 1950 годзе праведзена ўзбуйненне калгасаў. Цяпер калгас імя Будзённага аб'ядноўвае тры вёскі: Даленшчыну, Вярхоўцы і Асавец. Нікалай Сцяпанавіч Сапега і члены праўлення разам з усімі калгаснікамі пачалі распрацоўваць план перабудовы ўсёй гаспадаркі арцелі, зыходзячы з новых умоў. Так, напрыклад, у 1951 годзе было рашана перавесці ўсю буйную рагатую жывёлу ў вёску Вярхоўцы, дзе былі пабудаваны неабходныя памяшканні для яе ўтрымання.

— Чаму мы рашылі ўсю буйную рагатую жывёлу перавесці ў в. Вярхоўцы? — запытвае т. Сапега і адразу дае адказ. — Таму, што там маюцца добрыя ўмовы для яе ўтрымання: рака і добрыя выпасы, па-другое таму, што зямля ў Вярхоўцах мала ўрадлівая і патрабуе больш гною. Увесь гной з жывёлагадоўчых ферм пойдзе на ўгнаенне палёў і тым самым будзе павялічвацца ўраджайнасць.

1951 сельскагаспадарчы год быў годам вялікіх дасягненняў будзёнаўцаў. У іх лепшая ў раёне жывёлагадоўчая гаспадарка і ў першую чаргу вялікіх поспехаў дабіліся свінаводы, кіруемыя Аляксандрай Валюжэніч.

Добрых поспехаў дасягнулі хлебаробы і ў раслінаводстве. Брыгада Сідара Францкевіча дабілася добрых вынікаў у вырошчванні збожавых культур. На 18 гектарах Францкевіч атрымаў па 22 цэнтнеры азімага жыта, а на 60 гектарах больш 14—16 цэнтнераў. Ураджай аўса дасягнут па 14—16 цэнтнераў з гектара. Брыгада Чарняўскага, вылучанага на пасаду старшыні сельсовета, дабілася ўраджаю ячменю на плошчы ў 4 гектары па 20 цэнтнераў, а на ўсёй астатняй плошчы па 12—13 цэнтнераў з гектара. Атрымац добры ўраджай бульбы. Трэба адзначыць, што ўраджай 1951 года намнога перавышае ўсе ўраджаі да ўзбуйнення калгаса.

— Раней, — гаворыць брыгадзір Сідар Францкевіч, — мінеральныя ўгнаенні і правілы агратэхнікі недаацэньваліся, а зараз кожны калгаснік даражыць кожным грамам угнаенняў, выконваюцца ўсе ўказанні агранома. У нас вялікі і дружны калектыў. Ёсць шмат стаханаўцаў. Гэта ў першую чаргу калгаснікі паляводчых брыгад. Нікалай Гагурын, Філіп Шынкароў, Ігнат Францкевіч, Паліна Барысенка, жывёлаводы Аляксандра Валюжэніч, Анастасія Новікава, Анна Філіповіч, Еўгенія Валюжэніч, Валянціна Пятухова, цясляры Грыгорый Мачульскі, Іван Янкін і другія. У нас вялікія магчымасці для развіцця гаспадаркі. Але каб добра выкарыстаць гэтыя магчымасці неабходна механізацыя ўсёй гаспадаркі, усіх працэсаў працы. Намячаем будаваць электрастанцыю, радыё вузел, клуб. Ужо маецца свая мельніца, устанавілі воўначоску. Заканчваецца тэлефанізацыя паляводчых брыгад. Але вельмі многа яшчэ трэба папрацаваць і свае планы члены сельскагаспадарчай арцелі паспяхова ператвораць у жыццё.

**М. Мельнікаў.**

Ф.27.Оп.2 Д.1.Л.72 .(1951г.)

# У калгасе „Ленінскі прызыў“



В. І. ЛЕНІН (Петраград. Ліпень 1920 года).

Члены сельгасарцелі „Ленінскі прызыў“ Паланіцкага сельсовета 28-ю гадавіну з дня смерці В. І. Леніна адзначаюць узмоцненай падрыхтоўкай да вясны. Ва ўсіх палядводчых брыгадах дружна праводзіцца работа па вывазцы гною на палі. На вывазцы гною працуе таксама і трактар. Трактарыст Матвей Паўлаў на вялікіх трактарных санях ужо вывез больш, 200 тон гною.

Усяго ў калгасе вывезена на палі тысячу тон гною, з склада Сельгасснаба завезена 50 тон мінеральных угнаенняў. **С. Сідарэнка**

Ф.27. Оп.2 Д.2.Л.6 . (1952г.)




Рашэннем Крычаўскага райсовета дэпутатаў працоўных і бюро райкома партыі на раённую дошку гонару занесены наступныя прадпрыемствы і калгасы, якія ў сацыялістычным спаборніцтве дабіліся высокіх вытворчых поспехаў:

1. Завод гумавых вырабаў (дырэктар т. Галкоўскі, сакратар партарганізацыі т. Марчанка, старшыня заўкома т. Хомчанка, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Крэстнікава), які выканаў вытворчы план першага квартала 1954 года па выпуску валавай і таварнай прадукцыі на 110,7 працэнта.

2. Торфапрадпрыемства «Калектыўная праца» (дырэктар т. Гупаў, сакратар партарганізацыі т. Марчанка, старшыня заўкома т. Антоненка, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Бялоў), якое выканала вытворчы план першага квартала 1954 года па выпуску валавай прадукцыі на 117,8 працэнта.

3. Дэпо чыгуначнага вузла станцыі Крычаў (начальнік т. Дзянісаў сакратар партбюро т. Кастылёў, старшыня мясцовага камітэта т. Бондараў, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Гердзі), калектыў якога значна перавыканаў план перавозак народна-гаспадарчых грузаў у першым квартале 1954 года з перавыкананнем тэхнічнай хуткасці на 1,5 працэнта.

4. Акцябрскі спіртзавод (дырэктар т. Гузікаў, сакратар партбюро т. Кандраценка, старшыня заўкома т. Сівадзедаў, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Мяшкова), які выканаў вытворчы план першага квартала 1954 г. па выпуску валавай прадукцыі на 103,2 працэнта.

5. Калгас «Заветы Ільіча» Сакольніцкага сельсовета (старшыня т. Абуховіч, сакратар партбюро т. Пяскоўскі, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Вішнеўскі), які перавыканаў план развіцця грамадскай жывёлагадоўлі ў 1953—54 гадах. На 100 га пахаты, лугоў і пасбішч тут маецца 28 галоў буйнай рагатай жывёлы, з якіх 13,8 галоў кароў; атрыман добры ўраджай ільну. Калгас узорна падрыхтаваўся і своечасова распачаў веснавыя палявыя работы.

6. Калгас імя Будзённага Баеўскага сельсовета (старшыня т. Малашанка, сакратар партарганізацыі т. Скражанка, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Філіпенка), які ў мінулым годзе атрымаў ураджай лубіну 18 цэнтнераў з аднаго гектара на плошчы 40 гектараў, узорна падрыхтаваўся да правядзення веснавых палявых работ.

7. Прамысловая арцель «Першае мая» (старшыня т. Азараў, сакратар партарганізацыі т. Гарохаў, сакратар камітэта ЛКСМБ т. Князькова), калектыў якой выканаў вытворчы план чатырох месяцаў бягучага года за 23 красавіка 1954 г.

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.86. (1954г.)

## Васіль Семчанка—перадавы камбайнер



Як толькі на палях калгаса „Чырвоны колас“ Зарубецкага сельсовета паспела жыта, камбайнер Васіль Семчанка з памочнікам Ягорам Дзядзюра вывеў свой палявы карабель на ўборку ўраджаю. Добра працуе камбайн. Штодзённа перавыконвае нормы камбайнер. Па становішчу на 1 жніўня ён ужо ўбраў 114 гектараў азімых.

Тав. Семчанка самааддана працуе ў гэтыя дні. Ён змагаецца за тое, каб за сезон убраць не менш 500 гектараў зернявых.

*На здымку: камбайнер В. Семчанка ўбірае ўраджай.*

Фото Д. Прахарэнкі.

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.160. (1954г.)



*Пётр Аляксеевіч Дубяга працуе конюхам. Ён паспяхова спраўляецца са сваімі абавязкамі. Ад дзесяці замацаваных за ім конематак т. Дубяга атрымаў дзевяць жарабят.*

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.251. (1954г.)



Калгасны ільнавод Елена Мінаўна Краўцова разам са сваім звяном атрымала па 6 цэнтнераў ільносемя з кожнага гектара на плошчы 8 гектараў. Не шкадуючы сваіх сіл, ільнаводы даглядалі пасевы, і таму такія выдатныя вынікі: кожны гектар ільну даў калгасу 12 тысяч рублёў прыбытку.



З вялікай любоўю і стараннасцю даглядае калгасны маладняк Аляксандра Дзем'янаўна Логвінава. Цыляты ў яе заўсёды напоены, накормлены, у цялятніку—чыстата. Сёлета яна вырасціла 30 цялят — калгасны статак павялічыўся яшчэ на 30 галоў.



У добрым стане трымае сваіх кароў даярка Наталля Маісееўна Балоннікава. Гэта дае ёй магчымасць няспынна павышаць прадуктыўнасць жывёлы. У гэтым годзе даярка ад 14 замацаваных за ёю кароў атрымала 14 цялят і надаіла па 1.300 літраў малака ад кожнай каровы.

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.251. (1954г.)

## ПЕРАДАВЫЯ ЖЫВЁЛАВОДЫ РАЁНА



*На здымку: (злева направа) цялятніца калгаса „Ударнік" гарадскога Совета Васілевіч Е. М., якая ў 1954 годзе вырасціла 46 цялят да шасцімесячнага ўзросту; даярка калгаса „Соцыялістычны шлях" гарадскога Совета Кардзенкова С. Ф., атрымаўшая 12 цялят ад замацаваных за ёю 12 нецелей; даярка калгаса „Ударнік" гарадскога Совета Ігнатушка М. Е., якая ад кожнай з 13 замацаваных за ёю кароў надаіла сёлета па 1.400 літраў малака.*

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.167. (1954г.)



**Ільнаводчае звяно К. Д. Шаўцовай у калгасе „Комінтэрн" Паланіцкага сельсовета сёлета вырасціла высокі ўраджай ільну. З кожнага гектара на плошчы 10 гектараў атрымана па 8,2 цэнтнера ільносемя і 20 цэнтнераў ільнотрасты.**

**На здымку: звеннявая К. Д. Шаўцова.**

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.254. (1954г.)

## Перадавы трактарыст раёна



★

В. Е. Лук'яненка, трактарыст другой Крычаўскай МТС, на сваім трактары „У—2" выканаў чатыры гадавых нормы. За зіму трактарыст абавязаўся выдатна адрамантаваць свой трактар, каб у будучым годзе дабіцца яшчэ лепшых поспехаў.

НА ЗДЫМКУ: трактарыст В. Е. Лук'яненка.

★

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.251. (1954г.)

## ПЕРАДАВІКІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ РАЁНА



*На здымку: (злева направа) А. А. Бутузаў, брыгадзір паляводчай брыгады імя Кірава, які атрымаў па 16 цэнтнераў лубіну з гектара на плошчы 5 гектараў; Н. В. Матвееў, брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Леніна Батвінаўскага сельсовета, які атрымаў па 16 цэнтнераў азімай пшаніцы з гектара на плошчы 3 гектараў; В. А. Барысенка, брыгадзір калгаса імя Будзённага, які атрымаў па 200 цэнтнераў бульбы з гектара на плошчы 20 гектараў.*

Ф.27. Оп.2 Д.4.Л.260. (1954г.)

## ПЕРАДАВЫЯ МЕХАНІЗАТАРЫ РАЁНА



На здымку: механізатары другой Крычаўскай МТС (злева направа) камбайнер В. І. Нікалаенка, які ўбраў 518 гектараў пасеваў, ільноцерабільшчык П. К. Малахаў, які за 16 дзён выцерабіў 54 гектары ільну і брыгадзір трактарнай брыгады В. Ф. Банадысенка, які выканаў план трактарных работ на 117 працэнтаў.

Ф.27. Оп.2 Д.2.Л.268. (1954г.)

## Перадавыя механізатары і хлебаробы раёна



НА ЗДЫМКУ: (злева направа) звеннявая калгаса імя Леніна Е. А. Анціпенка, якая атрымала па 6 цэнтнераў ільносемя з кожнага гектара на плошчы 6 гектараў; камбайнер 1-й Крычаўскай МТС А. П. Лучакоў, які ўбраў 220 гектараў збожжа і І. П. Машкетаў, машыніст „СКГ—4" з калгаса імя Сталіна Лабковіцкага сельсовета, які пасадзіў квадратна-гнездавым спосабам 60 гектараў бульбы і атрымаў па 210 цэнтнераў клубняў з кожнага гектара.

Ф.27. Оп.2 Д.2.Л.274. (1954г.)

## Перадавая даярка раёна



М. Е. Войціхава.

За апошнія гады наш калгас дабіўся значных поспехаў у развіцці жывёлагадоўлі. Няўхільна расце і прадуктыўнасць статку. У мінулым годзе я, напрыклад, ад кожнай каровы надаіла ў сярэднім па 1.400 літраў малака.

Сёлета маё абавязацельства — надаіць ад кожнай каровы не менш 1.600 літраў малака. На 1 ліпеня надой на адну карову склаў 1.088 літраў. Паміж даяркамі ў нас разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, заключаны сацыялістычныя дагаворы.

Зараз надоі значна павысіліся. У суткі ад кожнай каровы надойваю па 10 і больш літраў малака. За чэрвень надоі на карову склалі 302 літры. Даенне ў нас трохразовае. Перад даеннем абмываю каровам вымя і выціраю яго ручніком. Затым раблю лёгкі масаж.

Вопыт паказаў, што масаж вымя—абавязковае мерапрыемства. Ён садзейнічае развіццю малочных залоз, а значыць і прыбаўцы малака.

Вельмі важна добра выдойваць карову. Я заўсёды старанна выдойваю апошнія струменьчыкі малака, якія ўтрымліваюць найбольшы працэнт тлустасці.

Асабліва хачу спыніцца на важнасці індывідуальнага падыходу да жывёлы. Каровы вельмі чутка рэагуюць на адносіны да іх чалавека. І калі будзеш адносіцца да іх з ласкай, яны поўнасцю аддадуць малака.

Як вядома, летнія месяцы—самы спрыяльны час для атрымання высокіх надояў малака. Пашы ў нашым калгасе добрыя. Арганізавана лагернае ўтрыманне жывёлы. Пашы разбіты на ўчасткі. Для дойных кароў яны адведзены лепшыя і паблізу лагера.

Для павышэння прадуктыўнасці статку вялікае значэнне мае таксама пароднасць жывёлы.

Нашы жывёлаводы, як і ўсе калгаснікі, поўны рашучасці з чэсцю выканаць указанні партыі і ўрада па далейшаму развіццю грамадскай жывёлагадоўлі і павышэнню яе прадуктыўнасці. Будзем і надалей шырока прымяняць у сваёй практычнай рабоце дасягненні навукі і вопыт перадавікоў.

М. Войціхава,
даярка калгаса
„Запаветы Ільіча".

Ф.27. Оп.2 Д.5.Л.174. (1955г.)

## Перадавая даярка раёна



Р. М. Міхальчанка.

У сацыялістычным спаборніцтве жывёлаводаў раёна першынство ў ліпені заваявала даярка калгаса „Запаветы Ільіча" Раіса Міхайлаўна Міхальчанка. Ад кожнай замацаванай за ёю каровы яна надаіла 258 літраў малака. Рашэннем райвыканкома і райкома партыі таў. Міхальчанка прысвоена ганаровае званне лепшай даяркі раёна.

Даць Радзіме як мага больш малака—такія абавязацельствы даяркі, узятыя ў гонар ХХ з'езда Комуністычнай партыі Совецкага Саюза.

Ф.27. Оп.2 Д.5.Л.195. (1955г.)

## Наша мэта—высокія надоі



В. С. Шуткова

Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку справядліва называюць школай перадавога вопыту. Будучы на выстаўцы, я пазнаёмілася з перадавымі жывёлаводамі краіны. Галоўнае на што звярнула ўвагу, гэта на арганізацыю кармлення і раздою кароў.

Карова Пабеда аднаго з калгасаў Кастрамской вобласці, напрыклад, у суткі дае да 37 літраў малака. Яе высокія надоі абумоўлены расшыраным рацыёнам кармлення. У дзень жывёліне выдаецца толькі канцэнтратаў да 50 кілаграмаў, не лічачы зялёную падкормку і добрыя пашы.

Нямалаважнае значэнне ў павышэнні надояў малака іграе лагернае ўтрыманне жывёлы і зялёны канвеер. Паўстае пытанне: ці можам мы арганізаваць гэта ва ўмовах нашага калгаса? Безумоўна, можам. Усё залежыць ад ініцыятывы жывёлаводаў і праўлення арцелі. У нас зялёная падкормка арганізавана толькі для адной групы кароў. Выкарыстоўваючы ў якасці падкормкі вікааўсяную сумесь, даярка Марыя Ігнатушка ў мінулым месяцы дабілася сутачнага надою ад некаторых кароў сваёй групы па 15—17 літраў малака. Каровы-ж, якія не падкармліваюцца, даюць малака значна менш.

Узяць, напрыклад, кароў маёй групы. Іх у мяне 17 галоў. Зялёнай падкормкі ім не выдаю, затое арганізуем круглаcутачную пасьбу. Гэта таксама станоўча ўплывае на надоі малака. Такія каровы, як Пушка, Зорка, Радасць і Манголка ў дзень даюць па 10 літраў малака. Надоі, вядома, невялікія. Нашы каровы могуць даваць удвая больш.

Уключыўшыся ў спаборніцтва, мы абавязаліся атрымаць сёлета ад кожнай каровы па 1.600—2.000 літраў малака. Даяркі дапамагаюць адна другой. Калі ў першыя дні раздой вытваралі толькі Ігнатушка і Дзёміна, то цяпер яго вытвараюць усе даяркі. Даенне праводзім тры разы ў дзень у адзін і той-жа час. Малако ўлічваем паасобку ад кожнай каровы.

Прыехаўшы з выстаўкі, я стараюся набыты там вопыт прымяніць на сваёй ферме.

В. Шуткова,
даярка калгаса
„Ударнік".

Ф.27. Оп.2 Д.5.Л.179.(1955г.)

...новымі вытворчымі

## Даярка Раіса Іллянкова



Р. Іллянкова

Марыя Дзмітрыеўна Іллянкова шмат год была даяркай у калгасе „Запаветы Ільіча". Старая жанчына самаадданa працавала на даверaным ёй участку жывёлагадоўлі. За выдатныя працоўныя поспехі Марыя Дзмітрыеўна была вылучана кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, узнагароджана медалем удзельніка выстаўкі.

Але прышоў час, калі старой калгасніцы трэба было развітацца з работай на ферме. Хто заменіць яе?

Адказ на гэтае пытанне дала Марыі Дзмітрыеўне яе дачка — комсамолка Раіса. Яна сказала маці:

—Я пайду працаваць на ферму.

Гэта было два гады назад. На першых парах маладой даярцы давялося пераадолець нямала цяжкасцей. Таварышы па рабоце, зоатэхнік калгаса, загадчык фермы, сяброўкі-даяркі заўсёды дапамагалі Раісе парадай. А больш усіх дапамагала маці. Усё гэта не прайшло дарэмна.

Першы год прынёс комсамолцы Іллянковай працоўныя поспехі. Яна заваявала ў соцыялістычным спаборніцтве даярак калгаса адно з першых месц.

У гэтым годзе Раісе давялося спаборнічаць з самымі маладымі, але самымі лепшымі даяркамі калгаса „Запаветы Ільіча" — Зояй Варанцовай, Марфай Войціхавай і Раісай Міхальчанка.

Зоя Варанцова неаднаразова заваёўвала званне „Лепшай даяркі раёна". Не меншых поспехаў дабілася і Марфа Войціхава. Не шкадуючы сіл і часу, Раіса працавала на ферме. Яна старанна даглядала кароў, дакладна выконвала парады зоатэхніка Васкабойнікавай.

І днямі, калі былі падлічаны вынікі работы даярак за год, стала вядома, што Раіса Іллянкова надаіла ад кожнай замацаванай за ёю каровы 1.727 літраў малака. Толькі Зоя Варанцова дабілася вышэйшага паказчыку.

Комсамольцы-жывёлаводы калгаса „Запаветы Ільіча" дабіваюцца ўсё новых поспехаў у рабоце. І разам з імі самаадданa працуе Раіса Іллянкова.

М. Мельнікаў.

Ф.27. Оп.2. Д.5. Л.241.(1955г.)

## Даярка Марыя Іванова



М. Іванова.

У бягучым годзе жывёлаводы сельскагаспадарчай арцелі «Ленінскі прызыў» дабіліся значных поспехаў у павышэнні прадуктыўнасці грамадскай жывёлагадоўлі. На адну фуражную карову тут надоена па 1.121,9 кілограма малака. Адной з перадавых даярак калгаса з'яўляецца Марыя Дзем'янаўна Іванова. Ад 15 замацаваных за ёю кароў яна атрымала сёлета па 1.207 літраў малака.

Яшчэ з самага пачатку пашавага ўтрымання жывёлы Марыя Дзем'янаўна, уключаючыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за атрыманне высокіх надояў малака, марыла заваяваць права на ўдзел у раённай сельскагаспадарчай выстаўцы. І вось мара здзейснілася. Яна — удзельнік выстаўкі.

Па прадстаўленню раённага выставачнага камітэта за дасягнутыя поспехі ў павышэнні надояў малака даярка Марыя Іванова была зацверджана ўдзельнікам раённай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Ф.27. Оп.2. Д.5. Л.225. (1955г.)

## Лепшая даярка раёна



З. Варанцова.

На жывёлагадоўчай ферме я працую ўсяго толькі адзін год. Калі мая маці з даярак перайшла працаваць пастухом, я рашыла заняць яе месца на ферме.

Спачатку было занадта цяжка спраўляцца з работай. Я не ўмела правільна арганізаваць рабочы дзень. На дапамогу прышла маці. Яна перадала мне свой вопыт працы даяркай.

Пастаянна клапоціца аб нас загадчык фермы Герасім Арцёмавіч Іллянкоў. Ён заўсёды прыходзіць на дапамогу ў цяжкі момант. Дае карысныя парады. Зоатэхнік т. Воскабойнікава таксама часта бывае на нашай ферме, сочыць за правільным вырошчваннем кармоў і г. д.

У сваю чаргу, мы стараемся як мага лепш выконваць свае абавязкі.

У сваёй практыцы я шмат увагі ўдзяляю правільнаму кармленню кароў, з улікам іх індывідуальных асаблівасцей. Зоатэхнік пры састаўленні рацыёна кармоў заўсёды раіцца з даяркамі, улічвае нашы заўвагі і пажаданні. Вядома, што высокія надоі малака можна атрымаць толькі тады, калі каровам даецца шмат сакавітых кармоў. У пачатку лета, нягледзячы на тое, што каровы кругласутачна знаходзіліся на пашы, мы арганізавалі падкормку іх жомам.

Добры догляд за каровамі таксама мае вялікае значэнне для павышэння прадуктыўнасці статку. Я заўсёды прытрымліваюся строгага распарадку дня. Даенне кароў выконваю ў адзін і той-жа час, у адным і тым-жа месцы. Удасканальваю метады даення.

У бліжэйшыя дні каровы будуць пераведзены з луга на ферму. Тут будзе арганізавана зялёная падкормка. У якасці падкормкі выкарыстаем кукурузу. Добра арганізаваны догляд кароў дае станоўчыя вынікі. За дзевяць месяцаў нашы жывёлаводы дабіліся такога надою малака, які быў атрыман за ўсе 12 месяцаў мінулага года.

Сёлета я змагаюся за атрыманне ад кожнай каровы па 2 тысячы літраў малака.

З. Варанцова,
даярка калгаса
„Запаветы Ільіча".

Ф.27. Оп.2. Д.5. Л.229.(1955г.)



Лепшыя ільнаводы раёна

Ільнаводчае звяно калгаса „Комінтэрн" Паланіцкага сельсовета, якім кіруе комсамолка Клаўдзія Шаўцова, заслужана лічыцца перадавым у нашым раёне. Сёлета ільнаводы гэтага звяна дабіліся рэкорднага ўраджаю—па 11 цэнтнераў ільносемя і амаль столькі-ж ільноваланна з кожнага гектара.

На здымку: (зверху ўніз) звенявая Клаўдзія Шаўцова, Анна Шаўцова, Любоў Шаўцова, Еўдакія Шахрай, Соф'я Шахрай.

*Фотамантаж Д. Прахарэнні.*

Ф.27. Оп.2. Д.5. Л.255.(1955г.)



# ПА НАШАМУ РАЁНУ

*Добры ўраджай ільну ў бягучым годзе атрымала ільнаводчае звяно Еўдакіі Сямёнаўны Падрэзенка з калгаса „Запаветы Леніна" Маляціцкага сельсовета. Яно вырошчвала лён на плошчы ў 11 гектараў. З кожнага гектара ільнаводы атрымалі па 4,3 цэнтнера ільносемя і па 14,5 цэнтнера трасты. Уся ільнотраста здана дзяржаве першым нумарам.*

*На здымку: звенявая Е. С. Падрэзенка.*

## За бесперабойную працу

Рабочыя паліўнага склада станцыі Крычаў дзейсна рыхтуюцца сустрэць знамянальную дату—XX з'езд КПСС. Яны своечасова падрыхтоўваюць шыхт вугалю для запраўкі паравозаў.

Добрасумленна працуюць вугальшчык Г. Камбаеў і стрэлачнік І. Салошка. Яны ўзнагароджаны мясцовым камітэтам Ганаровымі граматамі. Іх прыкладу следуюць таксама рабочыя І. Сапега, Ф. Туркоў, А. Ганчарова. Свае зменныя заданні яны выконваюць на 160—185 працэнтаў. Добра працуюць дзяжурныя па складу тт. Корбан і Ігнатаў.

На складзе няма парушэнняў працоўнай дысцыпліны. Рабочыя паставілі сваёй задачай і надалей не дапускаць перабояў у запраўцы паравозаў палівам пры любых умовах зімы.

А. Малахаў,
сакратар партарганізацыі склада.

*Добры ўраджай ільну ў бягучым годзе атрымала ільнаводчае звяно Веры Барысаўны Якіменкі з калгаса „Запаветы Леніна" Маляціцкага сельсовета. Яно вырошчвала лён на плошчы ў 11 гектараў. З кожнага гектара ільнаводы атрымалі па 4,3 цэнтнера ільносемя і па 14,5 цэнтнера трасты. Уся ільнотраста здана дзяржаве першым нумарам.*

*На здымку: звенявая В. Б. Якіменка.*

## *Робяць станкі*

На авечкагадоўчай ферме калгаса «Ленінскі прызыў» ідзе будаўніцтва станкоў у аўчарніку. На гэтай рабоце занята спецыяльная брыгада цесляроў з пяці чалавек, якую ўзначальвае Грыгорый Рубанаў. Ужо зроблена 14 станкоў. У кожным з іх будзе размешчана па 10 авечак.

Праз дзень-два будаўніцтва станкоў будзе закончана поўнасцю.

В. Лук'янчык.

## Дэпутат у выбаршчыкаў

Не так даўно дэпутат абласнога Совета дэпутатаў працоўных Філіп Сідаравіч Новікаў сустрэўся са сваімі выбаршчыкамі — хлебаробамі калгаса імя Будзённага. Ён расказаў працаўнікам палёў аб клопатах партыі і ўрада па павышэнню матэрыяльнага і культурнага дабрабыту народа, аб міралюбівай знешняй палітыцы Савецкага Саюза.

У адказ хлебаробы далі слова ўзорна падрыхтавацца да веснавой сяўбы будучага года.

В. Філіпенка.

## *Стрымалі слова*

На раённай нарадзе, якая адбылася ў мінулым месяцы фінансавыя работнікі ўзялі абавязацельства—да прадстаячай абласной партыйнай канферэнцыі забяспечыць поўны збор наяўных грошай па падпісцы на Дзяржаўную пазыку развіцця народнай гаспадаркі СССР (выпуск 1955 года). Сваё слова яны стрымалі. Першым закончыў збор грошай падатковы агент А. Афанасьеў (Маляцічы).

Ф.27. Оп.2. Д.5. Л.303.(1955г.)



Лепшыя ільнаводы раёна

Члены ільнаводчага звяна Клаўдзіі Шаўцовай сёлета не толькі працавалі ў полі. Яны таксама актыўна дапамагалі калгасным жывёлаводам у будаўніцтве сіласных збудаванняў. Гэтай вясной ільнаводы вырылі тры катлаваны агульнай ёмістасцю ў 600 тон і сваімі сіламі абліцавалі іх, сэканоміўшы тры тысячы рублёў калгасных грошай.

На здымку: члены звяна (зверху ўніз) Ульяна Лявонава, Елена Лявонава, Таіса Лявонава, Вера Бушнова і Ніна Грыцова.

*Фотамантаж Д. Прахарэнні.*

Ф.27. Оп.2. Д.5. Л.256.(1955г.)

Важно отметить, что восстановление сельского хозяйства было сопряжено с трудностями, такими как нехватка рабочей силы, техники, удобрений, а также последствия войны. Тем не менее, благодаря самоотверженному труду передовиков, сельское хозяйство БССР удалось восстановить и значительно развить.











Основание: Ф. 27.Оп.2. Д. 1,2,4,5.